СМЕРТЬ НЕМЕЦКИМ ОККУПАНТАМ!

# Бюллетень
## „СЯЛЯНСКАЙ ГАЗЕТЫ“

ОРГАН ВИЛЕЙСКОГО ОБКОМА КП(б) БЕЛОРУССИИ

№ 16 ИЮНЬ 1943 г.

ПРОЧИТАЛ — ПЕРЕДАЙ ДРУГОМУ

**Набліжаецца час рашаючых баёў! Усе насельніцтва весак і гарадоў Вілейшчыны, узнімайся на барацьбу супроць нямецкіх акупантаў!**

**На святую помсту выходзь, беларускі народ!**

# УСИЛИВАТЬ УДАРЫ ПО ВРАГУ С ТЫЛА!

Немецко-фашистские захватчики уже изведали силу сокрушительных ударов нашей Красной Армии.

Ударами по врагу с тыла, славные партизаны и партизанки помогают Красной Армии очищать советскую землю от фашистской нечисти, приближают радостный день грядущей победы. Уже десятки тысяч немцев нашли себе могилу от партизанских пуль, тысячи воинских эшелонов и обозов подорвались на партизанских минах.

Красная Армия готовится к решающим боям. Священный долг народных мстителей — всеми силами помогать Красной Армии в борьбе за советскую родину и с каждым днем усиливать удары по врагу с тыла.

Партизаны и партизанки! Находите всюду и беспощадно уничтожайте проклятых немцев. Пусть ежедневно тысячами гибнут немецкие поработители от партизанских пуль.

По дорогам Вилейщины не должен пройти ни один эшелон, ни один обоз с живой силой и техникой врага. Чем больше будет уничтожено проклятой немчуры, тем быстрее наша родная советская земля будет очищена от ига немецких оккупантов.

## ПОТЕРИ НЕМЕЦКОЙ АВИАЦИИ

С 6 по 12 июня в воздушных боях, на аэрадромах противника, огнем зенитной артиллерии и войск уничтожено 498 немецких самолетов. Кроме того, большое количество самолетов уничтожено и повреждено в результате налетов крупных сил советской авиации на аэродромы противника.

М. МАШАРА.

## Прысуд

Мне не для песні трэба словы,
Абвінавачанне пішу.
Прысуд бязлітасны, суровы
Злачынцам вынесці хачу.

Вось тым,
Што сонца пагасілі,
Што залілі зямлю крывёй.
Наклічу сведкамі магілы,
І боль збяру зямлі ўсёй.

Сумленне, веру, не забіта,
Я разбуджу яго ў людзей.
Хай гнеў
Узрывам дынаміта
Ушыр і ўдоўж зямлі ідзе.

Хай распрастае спіны, рукі
Усім, каго скруціў прыгнёт.
Няхай збярэ цярпенне, мукі
І рушыць помстай у паход.

Жывымі спаленыя дзеці,
Ахвяры шыбеніц усіх
Загад далі нам:
Помсціць смерцю
Катам
За кроў і мукі іх.

За крыўды ўсе маёй радзімы,
За здзек,
Што мой народ нясе,
За папялішчы і руіны
Прысуд — адзіны,
Кара — смерць!

За слёзы,
Што гараць вугаллем,
За смутак,
Што агнём пячэ
Прысуду прасяць поле, далі,
І травы шэпчуць:
Смерць, смерць, смерць.

## БАЯВЫЕ СПРАВЫ ПАРТЫЗАН

Мясцовае насельніцтва паведаміла партызанскому атраду Ж., што ў мястэчка Д. (Вілейская вобласць) прыбыў атрад нямецкіх карнікаў. Камандаванне партызанскага атрада прыняла рашэнне зрабіць раптоўны налёт на карнікаў.

Зрабіўшы начны пераход, партызаны на світанні акружылі мястэчка Д. і па камандзе адкрылі дружны агонь. Фашысты былі ахоплены панікай. Жыхары мястэчка паказвалі партызанам хаты, у якіх заселі немцы. Праз паўтары гадзіны гарачага бою, усе 40 карнікаў былі знішчаны.

Партызаны раздалі насельніцтву награбленыя немцамі хлеб, жывёлу, маёмасць і захапілі багатыя трафеі зброі і боепрыпасаў.

Партызан
Міхаіл П.

* * *

У адным з партызанскіх атрадаў, які дзейнічае ў Н-скіх раёнах Вілейскай вобласці, знаходзіцца сямья селяніна тав. А. Два сыны, дочка і сам тав. А. бязлітасна помсцяць нямецкім акупантам.

Аднойчы тав. А. з сынамі і дачкой прабраліся ў мястэчка К. і спалілі два нямецкіх склады з боепрыпасамі. На зваротным шляху ў лагер атрада, савецкія патрыёты ўзарвалі легкавую аўтамашыну, у якой ехаў афіцэр і 3 немцы.

За год баявой дзейнасці сямья тав. А. на сваім рахунку мае звыш 40 забітых немцаў, 2 разбітых аўтамашыны і каля 20 кіламетраў выразанай тэлеграфна-тэлефоннай лініі.

## По родной стране

### Продукция сверх плана

Доменщики Ново-Тагильского завода за пять с половиной месяцев выдали 3.500 тонн чугуна сверх плана для особого фонда Главного Командования.

***

За два месяца второго квартала Березниковский азотно-туковый завод передал в фонд Главного Командования несколько сот вагонов и цистерн продукции сверх плана.

### Охрана памятников героической обороны Сталинграда

Сталинградцы заботливо охраняют памятники героической обороны города, оставшиеся от дней немецкого нашествия. По мере восстановления города на зданиях устанавливаются мемориальные доски в честь доблестных частей и героев битв за Сталинград.

Музей обороны Царицина — Сталинграда организует большую выстовку, которая будет состоять из трех разделов: оборона Царицына, оборона Сталинграда и восстановление Сталинграда.

## НАШ ГНЕЎ УЗРЫВАМ ДЫНАМІТА УШЫР І ЎДОЎЖ ЗЯМЛІ ІДЗЕ!



### Адважныя падрыўнікі

Чыгуначны мост на важнай магістралі М.—П., каля ст. П. знаходзіўся пад узмоцненай аховай гітлераўцаў. Але група падрыўнікоў з партызанскага атрада тав. К. рашыла падняць яго ў паветра.

Выбраўшы цёмную ноч, калі марасіў цёплы вясенні дождж, адважныя падрыўнікі, непрыкметна, па ўзбярэжжу ручча, падпаўзлі і залажылі пад мост узрыўчатку. І калі падрыўнікі адыходзілі назад, іх заўважылі вартавыя маста і адкрылі стральяніну.

Камандзір групы тав. Л. не разгубіўся. Дачакаўшы, пакуль яго таварышы адпаўзлі ад маста на патрэбную адлегласць, ён падпаліў шнур. Праз мінуту ўзрыў, скалыхнуўшы зямлю, узняў высока ў паветра, на сваіх вогненных крыллях, 18 метровы мост. Адважны камандзір групы і ўсе падрыўнікі без страт вярнуліся ў свой лагер.

Партызан Л.

## За границей

### Бомбардировка Германии

За последние дни английские и американские бомбардировщики совершили налеты на Дюссельдорф, Бохум, Вильгельмсхафен Куксхафен, Бремен, Киль, Мюнстер и другие германские города. На Дюссельдорф и Мюнстер английские летчики сбросили свыше 2. 000.000 тонн бомб.

### УСПЕХИ НАШИХ СОЮЗНИКОВ

Войска наших союзников на подступах к Италии заняли итальянские острова в Сицилийском проливе—Пантелерию, Лампедузу, Линосу и Лампионе. На этих островах союзники захватили 18 тысяч итальянских пленных.

### БОМБАРДИРОВКА АЭРОДРОМОВ СИЦИЛИИ

Авиация союзников подвергает сильной бомбардировке итальянские аэродромы на острове Сицилия. Английские истребители—бомбардировщики атакавали аэродром Комизо, где возникли большие пожары.

## „ПРАЧАСАЛІ“

24 мая в Полацка вышаў нямецкі карны атрад. Ён быў добра ўзброены і налічваў больш 200 чалавек. Ён меў заданне „прачасаць“ лес у раёне мястэчка Р. і знішчыць адзін я партызанскіх атрадаў брыгады тав. М.

Наблізіўшыся да невялікага лесу, які перасякаў ім дарогу, карнікі рашылі прачасаць яго і адкрылі па лесе агонь.

У рэшце стральяніна скончылася. Лес таямніча маўчаў. Ні аднаго жывога гуку не даняслося да насцярожанага слуху гітлераўцаў. Асмеленыя гэтым фашысты падняліся ва ўвесь рост, ланцугом пайшлі да лесу.

Партызаны тав М., якія ляжалі на ўзлессі ў засадзе, падпусцілі іх па 50 метраў да сябе і толькі тады адкрылі па карніках свой знішчальны агонь. Першы лівень нечаканых партызанскіх залпаў як след працерабіў рады гітлераўцаў. Перапалоханыя карнікі рынуліся на зямлю і, выносячы параненых, папаўзлі назад.

Крыху спусця, партызаны, падабралі пакінутую фашыстамі зброю і боепрыпасы і забраўшы з сабой трох палонных рушылі ў свой лагер.

На месцы ўдачнай партызанскай засады засталося 83 забітых гітлераўцаў.

Не даязджаючы да Полацка, разбітыя нямецкія карнікі, спыніліся ў адной вёсцы, каб прывясці сябе ў належны выгляд. Тут яны выкінулі яшчэ 17 трупаў з ліку параненых, якія скапуцыліся па дарозе. Потым арганізавалі з месных жыхараў абоз, які паслалі на места бою за спакінутымі трупамі сваіх вояк. Выдалі загад меснаму старасту выкапаць, за вёскай пры дарозе некалькі ям і змайстраваць сто трун.

На гэтым і закончылі свой „баявы“ паход нямецкія карацелі.

Партызан Пётр.

РЭДКАЛЕГІЯ.